***Насця Жук,***
***Гімназія №2 г. Гродна, 10 клас.***

# *Мая малая радзіма*

*Кожны з нас прыпасае радзімы куток,*
*Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны*
Пімен Панчанка



Сонейка… Хуткая плынь мясцовай ракі… Гоман дрэў у суседнім бары… Чалавек стаіць ля двух крыжоў… Ён прыйшоў прыбраць магілкі сваіх бацькоў… У яго за плячыма – багаты жыццёвы вопыт, даўжынёю з цэлае жыццё, а перад вачамі кадры з маленства: вобразы бацькоў, цудоўнае надвор‘е і простае дзіцячае шчасце. “Захавай свае карані! Беражы малую радзіму!” – гаворыць нам лозунг з тэлеэкрана…

Гэты зусім звычайны рэкламны ролік – зварот да ўсіх беларусаў. 2018 год у Беларусі прызначаны Годам малой радзімы. Гэта значыць, што наша Беларусь, наша вялікая Радзіма, гэты кляновы лісток на карце свету, трымае ў сабе мільёны мястэчкаў і вёсак, гарадоў, лёс якіх часта вельмі сумны. Статыстыка палохае сваімі лічбамі. З кожным годам усё больш і больш маленькіх населеных пунктаў знікае з карты. Жыхары вёсачак перабіраюцца ў гарады, бліжэй да прагрэсу. У хатках дзе-нідзе застаюцца старыя людзі, якія не могуць і не жадаюць пакідаць свае гнёзды, з якімі звязана ўсё іх жыццё. Але калі едзеш і глядзіш у вокны, усё часцей кідаюцца ў вочы разваленыя хаткі, закінутыя, здзічэлыя дворыкі. І сэрца сціскаецца смутным болем. А раней тут звінеў вясёлы дзіцячы гоман, нечыя моцныя рукі з раніцы працавалі з рыдлёўкай, касой, плугам, і нават праз старыя ліштвы цягнуўся пах свежаспечанага хлеба. А дзе зараз гэта ўсё? Толькі ў памяці гэтых людзей, і то недзе вельмі глыбока, за ўсімі сучаснымі праблемамі і надзённымі справамі. А што станецца з гэтымі зарослымі мохам хаткамі? Хутчэй за ўсё, на іх месцы ляжа новая дарога ці пабудуецца новы гандлёвы або забаўляльны цэнтр. І нечая малая радзіма знікне з твару зямлі…

Таму мы павінны клапаціцца пра іх не менш, чым пра нашу Беларусь, і шанаваць гэтыя куточкі, неабавязкова, дзе мы нарадзіліся, але дзе жыве наша душа, дзе сэрца адпачывае. Як у песні пяецца:

Дом – гэта там, куды гатоў
Ты вяртацца зноў і зноў
Добрым, вясёлым, галодным і злым,
Ледзьве жывым, ледзьве жывым…

Кожны з гэтых куточкаў – дом хаця б аднаго чалавека, яго малая радзіма.

Усе мы смяяліся з прыгод Шурыка ў камедыі Леаніда Гайдая “Насланне”. І для многіх гледачоў Ліда – галоўная гераіня, простая дзяўчына з верша Яраслава Смелякова. І толькі для мяне слова “Ліда” адгукаецца цеплынёй у сэрцы. Ліда – старажытны горад, вядомы сваім цудоўным замкам, сваёй гісторыяй, сваімі людзьмі. Але я люблю Ліду не за яе слыннасць, не за тое, што тут княжыў славуты Гедымін, не за яе архітэктурную і прыродную прыгажосць.

Хоць сама я нарадзілася ў Гродне, Ліду я люблю значна больш. Яна вабіць мяне. З самага майго нараджэння я ўсе выхадныя і канікулы праводзіла ў Лідзе. Там жылі мае бабуля і дзядуля. Менавіта там я зрабіла свае першыя крокі, там навучылася бачыць прыгажосць у звычайным, навучылася цаніць жыццё. Там мы з дзедам зрабілі шпакоўню, і кожную раніцу ўвесну мяне маглі накарміць аўсянкай толькі пасля таго, як я ў акно ўбачу нашу сям’ю шпакоў. Там кожнае лета мы ставілі басейн, і мяне і маіх родных і стрыечных братоў цяжка было выцягнуць з яго. Мы проста плёскаліся, уздымалі фантаны пырскаў, вылазілі і з разбегу плюхаліся назад. Ад гэтага наша штучнае азерца мялела, і мы прасілі бабулю ізноў запоўніць яго да беражкоў. Зараз такое шчасце – успамінаць усё гэта.

Але помняцца не толькі забавы. Бабуля далучала нас да працы. Мы дапамагалі ёй у агародзе, а яна вучыла нас дагледаць расліны, адрозніваць карыснае ад пустазелля.



Там я ўпершыню праехалася на веласіпедзе. А яшчэ там недалёка ад нашай хаты было балота. І мы хадзілі туды лавіць жабак. Нам было цікава разглядаць іх маленькія пальчыкі, круглыя пузікі, вялікія вылупленыя вочкі. Нацешыўшыся, мы іх адпускалі і ішлі шчаслівыя дадому. А крыху ўбок ад балота была пустка, і мы зрабілі там стадыён. Гулялі ў вулічны футбол, без правілаў, бегалі навыперадкі і вярталіся дахаты стомленыя, замучаныя спякотай, часам з разбітымі каленямі, але ўсё роўна шчаслівыя.

Яшчэ далей праходзіла чыгунка. Мы любілі назіраць, як бягуць некуды цягнікі, махалі рукамі пасажырам у вокнах. Прыпамінаецца, мы збіралі шкляныя шарыкі, што часам знаходзілі ўздоўж рэек (відаць, іх вазіла нейкае прадпрыемства). У нас нават спаборніцтва было: хто болей знойдзе. І сёння ў маёй шкатулачцы ляжыць адзін з тых празрыстых прыгожых шарыкаў як напамінак аб дзіцячых прыгодах. А яшчэ ў гэтай шкатулачцы ляжыць каштанчык. Гэта ўжо каштанчык з майго дрэўца. З ім звязана свая гісторыя.

Ля дарогі да згаданай мной пусткі вырас сам па сабе маленькі каштан. Я не вельмі звяртала на яго ўвагу. Але аднойчы ўбачыла, як пасля дажджу яго залілі брудам машыны, і мне падалося, што дрэўца стаіць такое мурзатае, такое самотнае. Стала яго шкада. Я паклікала старэйшых братоў, і мы перасадзілі каштанчык далей, на ўтульным куточку з краю пусткі. Цяпер гэта ўжо вялікае дрэўца, у засені яго любяць летам гуляць суседскія дзяўчаткі. Яны рассцілаюць посцілкі

і бавяцца са сваімі лялькамі. Увогуле, калі я прыязджаю, абавязкова хаджу пабачыцца са сваім дрэўцам. І мне здаецца, яно радуецца, махае мне прыветна галінкамі, нібы вітаецца.

Мне ўяўляецца, што ўсё тут чакае мяне і радуецца. Тут каля хаты мяне заўсёды сустракае пухнаты разумны кот. Тут гул цягнікоў стаў ужо такім родным, блізкім. Тут вішні цвітуць неяк незвычайна і па-іншаму: шыкоўна і адначасова проста. Тут прайшло маё дзяцінства, тут усё здаецца асаблівым, выдатным і родным. Тут жыве мая душа. Тут – мая малая радзіма. Я ўпэўнена, што ніколі ў жыцці не забуду і не пакіну сваю Ліду.



Я не разумею тых людзей, якія не задумваюцца пра важнасць малой радзімы. Некаторыя едуць за сотні кіламетраў, каб толькі сабраць ураджай ці наладзіць шашлыкі. Але мала толькі ўспамінаць малую радзіму, важна і нешта для яе рабіць. Я з пашанай гляджу на людзей, якія сваімі ўчынкамі даказваюць сваю любоў да малой радзімы, аднаўляюць помнікі гісторыі, садзейнічаюць добраўпарадкаванню, робяць шмат карысных спраў. Яны хочуць зрабіць сваю малую радзіму прывабнай і цікавай для іншых, праявіць ініцыятыву і дапамагчы сваёй зямлі хто як можа і хто колькі можа, каб не было на нашай зямлі забытых, занядбаных мясцін. Хацелася б, каб так дзейнічаў кожны. І хай гэта стане яго памяццю, гісторыяй і любоўю.

*Фота аўтара.*